## Адкладальныя дзеясловы
## (Verba deponentia)

Гэта дзеясловы, якія маюць формы толькі залежнага стану, але з незалежным значэннем (пар.: баяцца, падабацца, здзекавацца і г. д.). Маюць тры асноўныя формы і дзве асновы:

| Асноўная форма | Аснова |
|---|---|
| 1. Praesens indicatīvi passīvi, 1 *sg.* | infectum |
| 2. Perfectum indicatīvi passīvi, 1 *sg.* | supīnum |
| 3. Infinitīvus praesentis passīvi | infectum |

Аснова perfectum адсутнічае:

| Спражэнне | Дзеяслоў | Пераклад |
|---|---|---|
| I | arbĭtror, arbitrātus sum, arbitrāri | *лічыць, меркаваць* |
| II | polliceor, pollicĭtus sum, pollicēri | *абяцаць* |
| IIIa | utor, usus sum, uti | *карыстацца* |
| IIIб | morior, mortuus sum, mori | *паміраць* |
| IV | orior, ortus sum, orīri | *узыходзіць, узнікаць* |

Утвараюць наступныя формы незалежнага стану:

| Форма | Прыклад | Пераклад |
|---|---|---|
| Participium praesentis actīvi | arbĭtrans | *які лічыць* |
| Participium futūri actīvi | arbitratūrus | *які мае намер лічыць* |
| Infinitīvus futūri actīvi | arbitratūrus esse | *лічыць* |

Адкладальныя дзеясловы могуць кіраваць зваротам accusatīvus cum infinitīvo, паколькі маюць незалежнае значэнне.

## Паўадкладальныя дзеясловы
## (Verba semideponentia)

Гэта дзеясловы, якія ад розных асноў утвараюць формы розных станаў, захоўваючы значэнне незалежнага стану. Існуе два віды такіх дзеясловаў.

1. Формы сістэмы infectum (praesens, imperfectum, futūrum I) утвараюцца ў незалежным стане, формы сістэмы perfectum (perfectum, plusquamperfectum, futūrum II) — у залежным.

Маюць тры асноўныя формы і дзве асновы:

| Асноўныя формы | Асновы |
|---|---|
| 1. Praesens indicatīvi actīvi, 1 *sg.* | infectum |
| 2. Perfectum indicatīvi passīvi, 1 *sg.* | supīnum |
| 3. Infinitīvus praesentis actīvi | infectum |

Аснова perfectum адсутнічае:

| Дзеяслоў | Пераклад |
|---|---|
| audeo, ausus sum, audēre, 2 | *асмельвацца* |
| gaudeo, gavīsus sum, gaudēre, 2 | *радавацца* |
| soleo, solĭtus sum, solēre, 2 | *мець звычай* |
| confīdo, confīsus sum, confidĕre, 3 | *давяраць* |

2. Формы сістэмы infectum (praesens, imperfectum, futūrum I) утвараюцца ў залежным стане, формы сістэмы perfectum (perfectum, plusquamperfectum, futūrum II) — у незалежным.

Маюць тры асноўныя формы і дзве асновы:

| Асноўная форма | Аснова |
|---|---|
| 1. Praesens indicatīvi passīvi, 1 *sg*. | infectum |
| 2. Perfectum indicatīvi actīvi, 1 *sg*. | perfectum |
| 3. Infinitīvus praesentis passīvi | infectum |

Аснова supīnum адсутнічае:

| Дзеяслоў | Пераклад |
|---|---|
| revertor, reverti, reverti, 3 | *вяртацца* |